УДК 82.0

# Мастацкі канцэпт у кантэксце сучаснай навукі пра літаратуру

**Дубоўская Т.А.**
***Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск***

*У артыкуле з дапамогай дэскрыптыўнага і кампаратыўнага метадаў даследавання разглядаюцца культуралагічныя, псіхалінгвістычныя работы (айчынных і замежных даследчыкаў), якія прысвечаны тэарэтычнаму вывучэнню тэрміна "канцэпт". На аснове прааналізаваных дэфініцый канцэпту ў сумежных навуковых дысцыплінах прапанаваны літаратуразнаўчы падыход да вывучэння мастацкага канцэпту, які разглядаецца даследчыкамі як сродак выяўлення індывідуальна-аўтарскага светабачання і як элемент нацыянальнай мастацкай карціны свету, нацыянальнай культурнай традыцыі.*
*Звяртаецца ўвага на структуру канцэпту і яго дыялагічную прыроду. Даецца азначэнне канцэптасферы як сукупнасці канцэптаў у канкрэтным мастацкім творы ці творчасці аўтара. Аналіз канцэптасферы дазваляе акцэнтаваць увагу на "пазатэкставых" сувязях твора, на ўключанасці апошняга ў камунікатыўны акт, гістарычны і культурны кантэксты канкрэтнай эпохі.*
***Ключавыя словы:*** *канцэпт (мастацкі канцэпт, індывідуальна-аўтарскі канцэпт), нацыянальная мастацкая карціна свету, культурны вопыт, канцэптасфера, міждысцыплінарны падыход, камунікатыўны акт.*

*(Ученые записки. – 2013. – Том 15. – С. 118–123)*

# Artistic Concept in the Context of Modern Literature Studies

**Dubovskaya T.A.**
***Educational establishment "Vitebsk State University named after P.M. Masherov", Vitebsk***

*The article reports findings of comparative and descriptive study into theoretical research of the term "concept" in culturological and psycholinguistic works of foreign and home scholars. Based on the analysis of definitions of the concept used in interdisciplinary research literature study approach to the study of artistic conceptis is proposed, which is considered by researchers as a means of individual author's world-view detection, as well as an element of national artistic picture of the world and national cultural tradition.*
*Attention is paid to the structure and dialogical nature of the concept. The concept sphere is defined as a set of concepts in a single or in all author's works. The concept sphere analysis emphasizes extra text connections of the work, its involvement in a speech act, in historical and cultural context of a given age.*
***Key words:*** *concept, (artistic concept, individual author's concept), national artistic picture of the world, concept sphere, cultural knowledge, interdisciplinary approach, speech act.*

*(Scientific notes. – 2013. – Vol. 15. – P. 118–123)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* skryniatani@mail.ru – **Т.А. Дубоўская**

Тэрмін "канцэпт" шырока выкарыстоўваецца ў розных дысцыплінах: філасофіі, кагнітыўнай псіхалогіі, кагнітыўнай і культуралагічнай лінгвістыцы. Найбольш аўтарытэтнымі даследчыкамі ў распрацоўцы праблемы канцэпту ў пазначаных галінах ведаў з'яўляюцца Д.С. Ліхачоў, Ю.С. Сцяпанаў, З.Д. Папова, І.А. Сцернін, У.І. Карасік, В.А. Маслава, С.Г. Варкачоў, А.С. Кубракова, В.М. Тэлія, А.П. Бабушкін, Л.У. Мілер, Н.С. Балотнава. Тэрмін "канцэпт" актыўна функцыянуе і ў літаратуразнаўстве, захоўваючы шматзначнасць, якая адпавядае распаўсюджанай у сучаснай навуковай парадыгме тэндэнцыі да міждысцыплінарнасці. У працах вучоных (В.Я. Бяспалавай, Н.А. Бяловай, В.А. Маславай, Е.А. Лявонавай, Л.У. Іконнікавай) паняцце "канцэпт" звычайна выкарыстоўваецца пры аналізе канкрэтных твораў або творчасці таго ці іншага пісьменніка. Тэарэтычнай распрацоўцы дэфініцыі "канцэпт" прысвяцілі свае літаратуразнаўчыя артыкулы І.А. Тарасава, Т.І. Васільева, Г.А. Зябрава, Н.В. Красоўская. Адной з найбольш структураваных, падагульняючых сучасных літаратуразнаўчых прац з'яўляецца манаграфія Н.У. Валодзінай "Канцэпты, універсаліі, стэрэатыпы ў сферы літаратуразнаўства", у якой даследуецца праблема літаратурных канстант (канцэптаў, універсалій, стэрэатыпаў) у тэарэтычным і гісторыка-літаратурным аспектах. У працы аўтар аналізуе розныя вызначэнні канцэпту, якія існуюць у межах філасофскага, псіхалагічнага, культуралагічнага навуковых дыскурсаў, і прапаноўвае свой падыход да вывучэння канцэпту ў літаратуразнаўчым кантэксце.

Актуальнай задачай для сучаснага літаратуразнаўства, у тым ліку беларускага, з'яўляецца тэарэтычная распрацоўка дэфініцыі "мастацкі канцэпт" ва ўласна літаратуразнаўчым аспекце.

Мэта працы – прасачыць гісторыю вылучэння і вызначэння дэфініцыі "канцэпт" ("мастацкі канцэпт") у навуковых працах сучасных лінгвістаў, культуролагаў, літаратуразнаўцаў.

**Матэрыял і метады.** У аснове артыкула – аналіз літаратуразнаўчых работ, прысвечаных тэарэтычнаму вывучэнню тэрміна "мастацкі канцэпт". На аснове дэскрыптыўнага метаду аналізуюцца розныя падыходы айчынных і замежных даследчыкаў (Е.А. Лявонавай, І. Забалотнай, В.А. Маславай, В.Я. Бяспалавай, Т.І. Васільевай, Н.У. Валодзінай, В.Г. Зусмана) да вывучэння гэтага паняцця. З дапамогай кампаратыўнага метаду супастаўляюцца дэфініцыі мастацкага канцэпту, выяўляюцца падабенства, адрозненне, спецыфіка погляду вучоных на пазначаны тэрмін.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Слова "канцэпт" запазычана лінгвістамі з матэматычнай логікі. Трывала ў абсяг сучасных гуманітарных ведаў слова "канцэпт" уведзена С.А. Аскольдавым у 1928 годзе. У сваім артыкуле "Слова і канцэпт" ён дае наступнае вызначэнне: "Канцэпт ёсць мысленнае ўтварэнне, якое замяняе нам у працэсе думання няпэўнае мноства прадметаў аднаго і таго ж кшталту" [1, с. 267]. Аднак, нягледзячы і на іншыя працы расійскага філосафа па названай тэме, да сярэдзіны мінулага стагоддзя слова "канцэпт" не разглядалася ў якасці тэрміна ў навуковай літаратуры. Тлумачылася гэта тым, што доўгі час тэрміны "паняцце" і "канцэпт" атаясамліваліся ў навуцы ("Лагічны слоўнік-даведнік" М.І. Кандакова, "Лінгвістычны энцыклапедычны слоўнік" В.М. Ярцавай, "Філасофскі энцыклапедычны слоўнік" пад рэдакцыяй Л.Ф. Ільічова).

Толькі з пачатку 90-х гг. ХХ ст. тэрмін "канцэпт" стаў актыўна ўжывацца ў лінгвістычнай літаратуры. Сёння большасць вучоных прытрымліваюцца думкі аб адрозненні канцэпту ад паняцця (Д.С. Ліхачоў, Ю.С. Сцяпанаў, В.А. Маслава, А.С. Кубракова, В.М. Тэлія, С.С. Нярэціна, Л.А. Касьян). Па-

няцце адлюстроўвае найбольш агульныя, важныя, значныя прыкметы прадметаў і з'яў. Сэнсавае ж напаўненне канцэпту заўсёды шырэйшае, большае, чым значэнне слова. Канцэпт адлюстроўвае не толькі аб'ектыўны змест, але і суб'ектыўны – асацыяцыі, думкі, фантазію чалавека. Змест канцэпту залежыць ад індывідуальнага культурнага вопыту асобы. Як зазначае І. Забалотная, "калі паняцце ўдакладняе, пастуліруе штосьці, звязвае разнастайнасць суб'ектаў у нейкае аб'ектыўнае адзінства, выконвае функцыі станаўлення думкі незалежна ад зносін, то канцэпт заахвочвае да разважання, накіраваны на дыспут з яго мноствам поглядаў і належыць філасофіі"
[2, с. 89].

У наш час існуе вялікая колькасць дэфініцый і падыходаў да разумення паняцця "канцэпт", і таму знайсці адно ўніверсальнае азначэнне проста немагчыма. Напрыклад, даследчыца кагнітыўнай лінгвістыкі В.А. Маслава прапаноўвае ў якасці рабочага наступнае: канцэпт – гэта "семантычнае ўтварэнне, якое вызначаецца лінгвакультурнай спецыфікай і тым ці іншым чынам характарызуе носьбітаў пэўнай этнакультуры. Канцэпт, адлюстроўваючы этнічнае светабачанне, маркіруе этнічную моўную карціну свету і з'яўляецца цаглінкай для будаўніцтва "дома быцця" (паводле М. Хайдэгера). Але ў той жа час – гэта нейкі квант ведаў, які адлюстроўвае змест усёй чалавечай дзейнасці. Канцэпт не непасрэдна ўзнікае са значэння слова, а з'яўляецца вынікам сутыкнення слоўнікавага значэння слова з уласным і народным вопытам чалавека (паводле Д.С. Ліхачова). Ён акружаны эмацыянальным, экспрэсіўным, ацэначным арэолам" [3, с. 36]. Гэта значыць, што акрамя паняційнай асновы канцэпт уключае сацыя-псіха-культурную частку: асацыяцыі, эмоцыі, ацэнкі, нацыянальныя вобразы і канатацыі, характэрныя для пэўнай культуры. І тут нельга не пагадзіцца таксама з думкай даследчыка Ю.С. Сцяпанава, які сцвярджае, што канцэпты не толькі мысляцца, але і перажываюцца носьбітамі мовы. Яны з'яўляюцца прадметам эмоцый, сімпатый і антыпатый, а часам і сутыкненняў [4, с. 43]. Метадалагічнае значэнне мае і выснова В.А. Маславай аб тым, што "канцэпт мнагамерны, у ім можна выдзеліць як рацыянальнае, так і эмацыянальнае, як абстрактнае, так і канкрэтнае, як універсальнае, так і этнічнае, як агульнанацыянальнае, так і індывідуальна-асабістае" [3, с. 36].

Што да ўласна літаратуры, то тут тэрмін "канцэпт" толькі зацвярджаецца, таму існуе пэўная адвольнасць яго ўжывання, "размытасць межаў", шматзначнасць. Канцэпт часта разглядаецца літаратуразнаўцамі ў двух накірунках: як індывідуальна-аўтарскае псіхічнае ўтварэнне і як элемент нацыянальнай мастацкай традыцыі, нацыянальнай мастацкай карціны свету [5, с. 742].

Індывідуальна-аўтарскі літаратурны канцэпт, на думку Г.А. Зябравай і С.В. Капусцінай, – гэта "базісная катэгорыя светабачання пісьменніка, якая ўвасоблена ў мастацкай тканіне яго твора (або шэрагу твораў)" [6, с. 10]. Індывідуальна-аўтарскія канцэпты дапамагаюць скласці духоўны партрэт пісьменніка на аснове канкрэтнага тэксту, выявіць яго светабачанне і спосабы мастацкага ўвасаблення гэтага светабачання. На аснове супастаўлення канцэптаў розных аўтараў можна вылучыць падабенства і адрозненне ў іх творчасці, прасачыць заканамернасці і дыялектыку функцыянавання канцэптаў у літаратурным працэсе [6, с. 8]. Даследчыца В.Я. Бяспалава разглядае мастацкі канцэпт як "адзінку свядомасці паэта ці пісьменніка, якая атрымлівае сваю рэпрэзентацыю ў мастацкім творы ці сукупнасці твораў і выражае індывідуальна-аўтарскае асэнсаванне сутнасці прадметаў і з'яў" [7, с. 6].

Канцэпт як элемент нацыянальнай культурнай традыцыі разглядае Н.У. Валодзіна. У сваёй манаграфіі "Канцэпты, універсаліі, стэрэатыпы ў

сферы літаратуразнаўства" яна дае наступную дэфініцыю мастацкага канцэпту: "Канцэпт – гэта сэнсавая структура, якая ўвасоблена ва ўстойлівых вобразах, што паўтараюцца ў межах пэўнага літаратурнага рада (у творы, творчасці пісьменніка, літаратурным накірунку, перыядзе, нацыянальнай літаратуры), якая валодае культурна значымым зместам, семіятычнасцю і ментальнай прыродай" [8, с. 19]. Даследчыца зазначае, што літаратура, утрымліваючы "калектыўны духоўны вопыт, захоўваючы памяць народа, заключае ў сабе разнастайны спектр сэнсаў, асацыяцый і ўяўленняў, канстантны і гістарычна зменлівы, які суадносіцца з гэтымі канцэптамі; аднак актуалізацыя тых ці іншых канстант, сувязі, што ўзнікаюць паміж імі, залежаць ад творчай асобы пісьменніка і адначасна выяўляюць яе" [8, с. 12].

На думку Ю.С. Сцяпанава, канцэпт – гэта "згустак культуры ў свядомасці чалавека; тое, у выглядзе чаго культура ўваходзіць у ментальны свет асобы" [4, с. 43]. Канцэпт разглядаюць у якасці асноўнай адзінкі нацыянальнага менталітэту як спецыфічнага індывідуальнага і групавога спосабу светаўспрымання і светаразумення. В.Г. Зусман вызначае літаратурны канцэпт як "вобраз, сімвал або матыў, які мае "выйсце" на геапалітычныя, гістарычныя, этнапсіхалагічныя моманты, што ляжаць па-за мастацкім творам" [9, с. 14]. Даследчык падкрэслівае, што менавіта "ўключанасць" у асацыятыўную прастору культуры робіць літаратурны вобраз канцэптам.

Разглядаючы канцэпт у літаратуразнаўчым аспекце, разгорнутае тлумачэнне тэрміну дае даследчыца Е.А. Лявонава: "Канцэпт – гэта складаны комплекс сэнсаў, пэўным спосабам структураваная сістэма ўніверсальных і індывідуальных значэнняў, якая дазваляе адэкватна спасцігнуць логіку аўтарскай задумы ці хоць бы наблізіцца да яе, убачыць свет вачыма пісьменніка і як непаўторна-ўнікальнай асобы, і як прадстаўніка сваёй нацыі і сваёй краіны, і як чалавека ўніверсальнага, носьбіта прапамяці, прагісторыі, пракультуры" [10, с. 12].

Мастацкі канцэпт мае шэраг сваіх спецыфічных рысаў, якія адрозніваюць яго ад канцэптаў іншага кшталту. Так, В.А. Маслава вылучае наступныя асаблівасці мастацкага канцэпту: "Па-першае, у аснове сувязі яго ляжыць асацыяцыя; па-другое, мастацкі канцэпт заключае ў сабе не толькі патэнцыю да раскрыцця вобразаў, але і разнастайныя эматыўныя сэнсы; па-трэцяе, мастацкі канцэпт імкнецца да вобразаў і ўтрымлівае ў сабе іх"; "у адрозненне ад абагульненых пазнавальных канцэптаў мастацкія канцэпты індывідуальныя, асобасныя, размытыя і псіхалагічна больш складаныя; гэта комплекс паняццяў, уяўленняў, пачуццяў, эмоцый, часам нават валявых праяўленняў, якія ўзнікаюць на аснове мастацкай асацыятыўнасці" [11, с. 34–35].

Падобную думку выказвае даследчыца Т.І. Васільева, якая сцвярджае, што канцэпт – "ментальнае ўтварэнне свядомасці пісьменніка, якое рэалізуе сваё сэнсавае значэнне ў семантыка-асацыятыўным кантэксце літаратурнага твора. Мастацкі канцэпт знаходзіць сваё вербальнае выражэнне ў мастацкім вобразе, сімвале, з'яўляецца адзінкай карціны свету пісьменніка, пранізвае ўсю структуру твора, мае выйсце за яго межы, звязваючы пэўны мастацкі тэкст з іншымі творамі пісьменніка, мастацкай літаратурай, культурнымі канстантамі нацыі" [12, с. 52].

Неабходна падкрэсліць, што мастацкі канцэпт валодае дыялагічнай, камунікатыўнай прыродай. У яго стварэнні ўдзельнічае не толькі пісьменнік, але і чытач. Канцэпт разлічаны на веды, памяць і фантазію чытача. Так, захоўваючы ў сваёй свядомасці ўнутраную форму канцэпту, чытач інтэрпрэтуе, рэканструюе яго, дзякуючы ўласнаму кагнітыўнаму вопыту, уласным асацыяцыям. Таму акрамя вербалізацыі канцэпту, яго ўнутранага напаўнення важная роля належыць та-

кому працэсу, як дадумванне, "дафантазіраванне". Усё гэта сведчыць пра складаную структуру канцэпту, якая будуецца з ядра (слоўнікавага значэння слова, а таксама іерархіі ўсіх значэнняў слова) і перыферыйных элементаў (культурнага вопыту, нацыянальнай традыцыі, асацыяцый і ўяўленняў чытача).

Паняцце канцэпту ў літаратуры цесна звязана з тэрмінам "канцэптасфера". Канцэптасфера – гэта сукупнасць канцэптаў, з якіх складаецца светабачанне носьбіта мовы. Даследуючы канцэпты ў мастацкіх творах пэўнага аўтара, можна вызначыць канцэптасферу ўсёй творчасці пісьменніка, г.зн. яго мастацкае бачанне і ўспрыманне свету ў цэлым. Аналіз канцэптасферы дазваляе таксама звярнуць увагу на "пазатэкставыя" сувязі твора, на ўключанасць апошняга ў камунікатыўны акт, гістарычны і культурны кантэксты канкрэтнай эпохі.

Існуюць так званыя "ўніверсальныя", асноватворныя канцэпты (дом, дарога, дзверы), "нацыянальныя", або "этнакультурныя" (хата, шлях, брама), а таксама індывідуальна-аўтарскія (хата, пакрытая крыламі ластавак; дарога, закалыханая жытам; парэпаная рама дзвярэй – у паэзіі М. Танка). Вобразы-канцэпты з'яўляюцца культурнымі ўніверсаліямі, нясуць глыбокі змест, канкрэтны, філасофскі і нават сакральны.

**Заключэнне.** Такім чынам, канцэпт уключае семантыку моўнага знака з яго канатацыйным элементам, а таксама ўласны і калектыўна-народны вопыт чалавека, яго ментальнасць. Канцэпты маюць эмацыйны і экспрэсіўны фон. У мастацкім творы канцэпт эстэтычна трансфармуецца, становіцца "мастацкім канцэптам" (тэрмін С.А. Аскольдава), які выяўляе асаблівасці стылю аўтара як эстэтычна арганізаванай сістэмы славесных формаў, што ўвасабляюць у тэксце погляды пісьменніка на жыццё. Разам з тым мастацкі канцэпт уяўляе сабой складаную зместавую структуру, у якой зліваюцца ў адзінае цэлае індывідуальна-аўтарскае разуменне і традыцыя нацыянальнага выкарыстання дадзенага канцэпту. Дзякуючы мастацкім канцэптам, чытач у творы можа ўбачыць як індывідуальна-аўтарскае асэнсаванне сутнасці прадметаў, так і погляд на іх у этнакультурным маштабе.

## Літаратура


1. Аскольдов, С.А. Концепт и слово / С.А. Аскольдов // Русская словесность: антология; под ред. В.Н. Нерознака. – М.: Academia, 1997. – С. 267–280.
2. Забалотная, І. Канцэпт вайны ў кантэксце ўніверсальнага і нацыянальнага / І. Забалотная // Роднае слова. – 2012. – № 5. – С. 89–93.
3. Маслова, В.А. Когнитивная лингвистика: учеб. пособие / В.А. Маслова. – Минск: ТетраСистемс, 2004. – 256 с.
4. Степанов, Ю.С. Константы. Словарь русской культуры / Ю.С. Степанов. – 3-е изд. – М.: Академический проект, 2004. – 992 с.
5. Тарасова, И.А. Художественный концепт: диалог лингвистики и литературоведения / И.А. Тарасова // Вестн. Нижегород. ун-та им. Н.И. Лобачевского. – 2010. – № 4(2). – С. 742–745.
6. Зябрева, Г.А. Концепт-анализ в современном литературоведении: теоретическая и методологическая проекции / Г.А. Зябрева, С.В. Капустина // Художественная концептосфера в произведениях русских писателей. – Магнитогорск: МаГУ, 2012. – Вып. IV. – С. 7–15.
7. Беспалова, О.Е. Концептосфера поэзии Н. Гумилева в ее лексикографическом представлении: автореф. дис. … канд. филол. наук. / О.Е. Беспалова. – СПб., 2002. – 24 с.
8. Володина, Н.В. Концепты, универсалии, стереотипы в сфере литературоведения: монография / Н.В. Володина. – М.: Флинта: Наука, 2010. – 256 с.
9. Зусман, В.Г. Диалог и концепт в литературе. Литература и музыка / В.Г. Зусман. – Н. Новгород: Деком, 2001. – 168 с.
10. Лявонава, Е.А. "Палову жыцця пішу на дарозе свае імёны, палову – закрэсліваю напісанае…" / Е.А. Лявонава // Роднае слова. – 2007. – № 12. – С. 12–15.

11. Маслова, В.А. Поэт и культура: концептосфера Марины Цветаевой: учеб. пособие / В.А. Маслова. – М.: Флинта: Наука, 2004. – 256 с.
12. Васильева, Т.И. Литературоведческий подход к изучению художественного концепта / Т.И. Васильева // Филологические науки. Вопросы теории и практики: в 2 ч. – № 7(18). – Ч. 1. – С. 51–54.

*Паступіў у рэдакцыю 17.05.2013 г.*

*Прыняты ў друк 24.06.2013 г.*